УДК 882.6-09

*Т.М. ГРЫЦАЛЬ*

# ФАРМІРАВАННЕ ТЭАРЭТЫКА-ЛІТАРАТУРНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ І МАСТАЦКА-ЭСТЭТЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ ВУЧНЯЎ У ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЫ Ў СТАРЭЙШЫХ КЛАСАХ

Вывучэнне мастацкай спецыфікі сучаснай беларускай прозы – адна з найважнейшых задач літаратурнай адукацыі ў сярэдняй школе. Сустракаючыся з празаічным творам, вучні трапляюць у сферу эстэтычнага ўплыву, таму ўзнікае эмацыянальны водгук, але ён далёка не заўсёды нават у старшакласнікаў з'яўляецца прыкметай граматнага чытача; часцей характарызуецца хісткасцю і павярхоўнасцю. У такой сітуацыі настаўніку неабходна абапірацца на навуковы грунт, выкарыстоўваць тэарэтычныя пытанні, якія дапамагаюць адкрыць эстэтычную рэчаіснасць і робяць яе ўздзеянне на асобу вучня больш моцным.

У вывучэнні празаічных твораў з улікам іх мастацкай адметнасці прадуктыўнай дамінантай, на наш погляд, з'яўляецца жанравая спецыфіка. Такое меркаванне абапіраецца на літаратуразнаўчыя даследаванні. Так, Артэга-і-Гасет лічыць,

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

што жанры ў літаратуры – гэта "субстанцыйны паэтычны змест", "эстэтычныя тэмы ", "якія ёсць не што іншае, як шырокія вуглы меркавання, пад якімі разглядаюцца найважнейшыя бакі чалавечага" [5, с. 174].

Эфектыўнасць жанру пры вывучэнні літаратурнага твора, у тым ліку празаічнага, адзначаецца ў працах, прысвечаных праблемам методыкі выкладання літаратуры (А.Астрагорскі, В.Вадавозаў, В.Стаюнін, З.Антонава, В.Галубкоў, Г.Гукоўскі, Н.Малдаўская, А.Маныкіна, З.Рэз; В.Івашын, М.Лазарук, В.Ляшук, М.Мішчанчук, А.Лугоўскі, Н.Рашэтнікава і інш.), [напрыклад, гл. 2, 3, 4].

Звернемся да некаторых аспектаў аналізу прозы з улікам яе мастацкай, жанрава-стылёвай спецыфікі на матэрыяле творчасці В.Быкава ў 11 класе.

"Знак бяды" – аповесць, найважнейшым элементам якой з'яўляецца трагедыя. Такая асаблівасць у многім абумоўлена тым, што ў XX стагоддзі трагедыя стала "звычайнай гісторыяй", таму як літаратурны жанр яна амаль знікла, але як элемент жанру прысутнічае ў многіх творах сучаснай літаратуры, у тым ліку і ў аповесцях В.Быкава. З улікам названых акалічнасцей можна правесці ўрок па тэме "Трагічнае як эстэтычная дамінанта аповесці "Знак бяды". Каб папярэдзіць наіўна-рэалістычнае ўспрыняцце творчасці В.Быкава, на ўступных занятках школьнікі знаёмяцца з трагічным як эстэтычнай катэгорыяй у форме лекцыі, выбар якой уяўляецца аптымальнай па дзвюх прычынах: па-першае, элементы лекцыі дазволілі зарыентаваць старшакласнікаў на абагуленае ўспрыняцце быкаўскай прозы (арыентуючая функцыя); па-другое, звесткі тэарэтычнага характару сталі своеасаблівым інструментам для больш глыбокага пранікнення школьнікаў у сэнс тэксту (інфармацыйная функцыя). Прыводзім прыкладны план матэрыялу, у якім адлюстраваны асноўныя прыкметы катэгорыі трагічнага і вызначаны напрамкі праблемнага вывучэння творчасці В.Быкава.

Сутнасць трагічнага:
– філасофскае асэнсаванне свету і існавання чалавека;
– паражэнне ці гібель прыгожага ў імя духоўных ідэалаў;
– цяжкія пакуты асобы, часам смерць як момант ісціны;
– пашырэнне магчымасцей чалавека, выхад за межы абставінаў;
– рэзкае (гранічнае) выяўленне дабра і зла, праўды і фальшу;
– супярэчнасці ў жыцці, невырашальныя толькі часова;
– пачуццё смутку і аптымізму, горычы і хараства, смерці і ўваскрэсення;
– бяссмерце асобы, што гіне.

Лекцыйная форма заняткаў патрабуе далейшай практычнай арганізацыі навучання, таму змест урока па аповесці "Знак бяды" вызначаецца тым, што вучні павінны выбраць з тэксту тыя факты, якія б пацвярджалі тэарэтычныя палажэнні пра сутнасць трагічнага. Абмеркаванне матэрыялу мае спрэчныя моманты, таму мэтазгодна звярнуцца да дыскусіі , якая ўключае наступныя пытанні:

1. Ці згодны вы з тым, што Сцепаніда Багацька – характар актыўны, Пятрок – пасіўны ў адносінах да абставінаў?
2. Трагічныя падзеі ў свеце (разладу ідэальнага і рэальнага ) можна пазбегнуць, ці гэта немагчыма? Абгрунтуйце адказ на аснове пісьменніцкай канцэпцыі свету.
3. Трагічны фінал аповесці азначае поўную перамогу зла над дабром і нараджае пачуццё смутку. Так ці не?
4. Ці можна назваць аповесць В.Быкава "Знак бяды" "знакам надзеі" для ўсяго чалавецтва?

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Настаўнік сочыць, каб асэнсаванне пытанняў адбывалася ў пазначаным кірунку і адпавядала той "агульнай праграме", што закладзена ў творы. Так, вучні схільны ўспрымаць вобраз Сцепаніды актыўным, а Пятра – пасіўным у адносінах да абставінаў. Такую думку неабходна карэкціраваць, вучыць школьнікаў бачыць актыўнасць не толькі ў знешніх паводзінах, але і ў характары, псіхалогіі беларуса, яго душы і свядомасці.

Канцэптуальнае разуменне старшакласнікамі прозы залежыць не толькі ад асэнсавання эстэтычнага фона твора, але і творчага метаду, якім карыстаўся аўтар. Жанравая спецыфіка дапамагае выявіць такія стылёвыя асаблівасці літаратуры: напрыклад, у творах лірычных жанраў генетычна закладзена схільнасць да рамантызму, у празаічных – да рэалізму, што пажадана ўлічваць на ўроках літаратуры. У прыватнасці, аналіз традыцый аналітычнай прозы з акцэнтам на прынцыпах рэалістычнай аповесці (праламленне творчага метаду ў жанры) можна выбраць тэарэтычным фонам да ўрока па вывучэнню аповесці "У тумане", прапанаванай праграмай для самастойнага чытання. Тэма ўрока – "Праблема маральнага выбару ў аповесці "У тумане ". Сутнасць работы заключаецца ў наступным: з пазіцыі гуманізму ацаніць маральны выбар Сушчэні; вызначыць, як інтэлектуальная аснова твора паглыбляецца за кошт праблемы выбару, цэнтральнай у творчасці пісьменніка; ахарактарызаваць рэалістычнасць мастацкага паказу рэчаіснасці.

Як паказалі праведзеныя даследаванні, для першаснага ўспрыняцця вучнямі вобраза Сушчэні характэрна ўяўленне пра недастатковасць волі і мужнасці. Дэталёвы аналіз тэксту дапамагае школьнікам зразумець, што Сушчэня супрацьстаіць найвялікшай нясправядлівасці не гасіллем, помстаю, апраўдваннем, а чалавечнасцю, мерай якой з'яўляецца сумленне. Дадзены этап урока неабходна падмацаваць думкаю аб тым, што творчасць В.Быкава мае рэалістычны напрамак, развіваецца ў рэчышчы еўрапейскай літаратуры, імкнучыся да вызначэння спосабаў выратавання гуманістычных каштоўнасцей, канцэптуальнага асэнсавання быцця .

Творы В.Быкава суадносяцца з традыцыямі рускай аналітычнай рэалістычнай прозы, напрыклад, Ф.Дастаеўскага. Як працяг гутаркі па праблеме маральнага выбару ў аповесці "У тумане" заключнае праблемнае заданне выглядае так: раман Ф.Дастаеўскага "Злачынства і пакаранне" пацвярджае, што шлях супрацьціўлення злу насіллем (адваротны таму, што выбраў Сушчэня) гістарычна безвыніковы. На прыкладзе вобраза Раскольнікава вызначце, чаму насілле і бунт не мяняюць свет да лепшага, пастарайцеся суаднесці свае меркаванні са зместам маральных праблем у аповесцях В.Быкава "У тумане", "Знак бяды".

Акцэнты можна расставіць наступным чынам: па-першае, насілле над злом разбурае асобу чалавека, які змагаецца такімі метадамі. Выкараняючы зло, Раскольнікаў сам становіцца злачынцам. Сцепаніда таксама нядоўга адчувала палёгку ад свайго пратэсту – схаванай ад немцаў зброі – маральнае задавальненне перарасло ў адчуванне трагічнай памылкі. Па-другое, супраціўленне несправядлівасці праз насілле можа прывесці да выпадковых ахвяр (забойства Лізаветы, смерць пастушка Янкі, на якога немцы ўсклалі адказнасць за крадзеж вінтоўкі).

Параўнальны аналіз дазваляе вучням прыйсці да высновы, што творчасць В.Быкава адпавядае гуманістычным ідэалам, прынцыпам аналітычна-рэалістычнай прозы, з'яўляецца ўключанай у сусветны дыялог культур.

Такім чынам, канцэптуальнае разуменне старшакласнікамі прозы В.Быкава забяспечваецца аналізам твораў праз прызму жанравай спецыфікі, вызначаль-

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

нымі рысамі якой з'яўляецца дамінаванне трагічнага як эстэтычнай асновы і аналітычна-рэалістычных прынцыпаў пісьма.

Уяўленне старшакласнікаў пра стылёвыя адметнасці прозы В.Быкава былі б няпоўнымі, калі ў якасці жанравай асновы аналітычнай аповесці прадставіць творчы метад пісьменніка выключна як рэалістычны. Даследчыкі Дз.Бугаёў, У.Конан, І.Афанасьеў, Н.Капшай, Е.Лявонава і інш. адзначаюць у творчасці беларускага пісьменніка экзістэнцыяльны кірунак [напрыклад, гл.1]. Дадзены матэрыял у школе можна выкарыстоўваць фрагментарна, адаптуючы да патрэб школьнай практыкі. Прапануем мадэль урока па тэме "Пошук вырашэння маральных праблем і спосабаў іх мастацкага ўвасаблення ў еўрапейскай і беларускай літаратуры" (на матэрыяле А.Камю "Чужаніца" і В.Быкава "У тумане"). Найважнейшым момантам у эфектыўнасці правядзення заняткаў бачыцца падрыхтоўчы этап. У прыватнасці, ва ўводным каментарыі да курса літаратуры ў 11 класе настаўнікам робіцца заўвага пра шляхі развіцця мастацтва слова ў XX стагоддзі – рэалістычнага і нерэалістычнага. Прыступаючы непасрэдна да правядзення заняткаў, неабходна яшчэ раз узнавіць у памяці вучняў гістарычны і культурны фон эпохі і напрамку экзістэнцыяналізму, што можна прадставіць у выглядзе табліцы.

**Сутнасная характарыстыка экзістэнцыйнага светапогляду**

| Кантэкст эпохі | Індывідуальны кантэкст напрамку |
|---|---|
| 1. Зніжэнне статуса чалавека, змяншэнне яго значнасці ў выніку стандартызацыі жыцця | Гуманізм, узвышэнне чалавека |
| 2. Духоўны крызіс грамадства | Варожасць свету, немагчымасць для чалавека выправіць неспрыяльны стан рэчаў, адчуванне пастаяннай трывогі, эгацэнтрычная замкнёнасць, абсурднасць існавання чалавека, закінутасць і незапатрабаванасць яго ў свеце. |
| 3. Пошук шляхоў выратавання гуманістычных каштоўнасцей | Неабходнасць дзейнічаць у адпаведнасці з патрабаваннем сумлення насуперак абставінам |

Каментуючы матэрыял, настаўнік звяртае ўвагу на тое, што ідэі экзістэнцыялізму знайшлі ўвасабленне ў мастацкай літаратуры, выбраўшы найбольш зручную жанравую форму – аналітычную прозу. Творы прадстаўляюцца наступным чынам: раман "Чужаніца" як класічны узор еўрапейскага экзінтэнцыялізму, аповесць "У тумане" – як рэалістычны твор з адзнакамі экзістэнцыялізму.

Каб замацаваць ва ўяўленні вучняў вызначальную ідэю экзістэнцыялізму – адзінокі чалавек у свеце абсурду,– неабходна прааналізаваць загалоўкі твораў. Падтэкст рамана А.Камю на аснове яго назвы для старшакласнікаў больш відавочны, аповесці В.Быкава – складаны, але па назвах іншых твораў ("Аблава", "Знак бяды", "Бедныя людзі") таксама зразумелы.

Асноўная частка ўрока грунтуецца на абмеркаванні пытанняў, прапанаваных адзінаццацікласнікам загадзя. У ходзе гутаркі ўстанаўліваецца наступнае. Галоўныя героі твораў – і Мёрсо, і Сушчэня – апынуліся па-за грамадствам, абыякавасць свету да асобнага чалавека зрабіла іх "чужымі сярод сваіх". Адчужанасць асобнага чалавека ставіць праблему камунікабельнасці людзей у цэлым. Праз актыўны роздум-дыялог з вучнямі высвятляецца, наколькі героі твораў адкрытыя ў адносінах да грамадства. Так, Мёрсо даволі абыякавы да жыцця, закрыты для людзей і Бога. Іншую жыццёвую пазіцыю займае Сушчэня, які імкнецца быць разам з іншымі людзьмі. Такім чынам, настаўнік падводзіць вучняў да ўсведамлення, што беларуская літаратура засвоіла традыцыі еўрапейскага

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

экзістэнцыялізму, але не капіраючы іх, а творча ўзбагачаючы здабыткі сусветнай літаратуры.

Наступны этап урока звязваецца з эстэтычным аналізам тэкстаў. Для экзістэнцыялізму характэрна апора на катэгорыю трагічнага. Да ўрока найбольш падрыхтаваным у гуманітарным плане вучням рэкамендуецца паназіраць за адрозненнямі паміж трагічным і жахлівым. Пры абмеркаванні іх выступленняў падкрэсліваецца, што трагічнае выяўляе часова невырашальныя супярэчнасці, актыўнасць героя, жахлівае – канфлікт, невырашальны ў прынцыпе, пасіўнасць; таму ў трагічным прысутнічае і аптымізм, у жахлівым – песімізм. Далей вучням прапаноўваецца шляхам параўнання вызначыць эстэтычны фон кожнага з твораў. Старшакласнікі заўважылі, што трывога, якую адчувае Сушчэня, звязана з немагчымасцю змяніць сітуацыю ў дадзены момант. Хоць канфлікт і здаецца жахлівым, невырашальным, Сушчэня знаходзіць выйсце, яго смерць не бессэнсоўная, бо яна ў імя дабра. Пазіцыя ж Мёрсо абыякавая, адчувае ён сябе нудна, што больш набліжана да жахлівага, адсюль у многім песімістычнае гучанне твораў А.Камю і іншых прадстаўнікоў экзістэнцыялізму. Трагічнае гучанне ў В.Быкава і А.Камю не тоеснае і адрозніваецца мерай аптымізму ў мастацкім асэнсаванні праблем быцця.

Такім чынам, сярод разнастайных падыходаў да вывучэння беларускай прозы ў старэйшых класах надзвычай эфектыўным бачыцца аналіз яе жанравай спецыфікі, якая дапамагае высвеціць тып мастацкай формы твора, дазваляе ацаніць яго па якасных, унутраных паказальніках (эстэтычны фон, творчы метад), што спрыяе фарміраванню тэарэтыка-літаратурнай кампетэнцыі і эстэтычнай культуры вучняў, актывізуе працэс навучання, спрыяе згарманізаванасці паміж тэарэтычным і ідэйным аналізам прозы.

У цэлым эксперыментальная методыка пацвердзіла, што параўнальнае вывучэнне аналітычнай беларускай і еўрапейскай прозы для старшакласнікаў з'яўляецца хоць і складаным, але даступным, апраўданым, бо істотна паглыбляе і ўзбагачае веды вучняў.

## ЛІТАРАТУРА


1. ***Афанасьеў І.*** Палюбіць чалавецтва: праблемы новага мыслення і новай маралі ў творчасці В.Быкава // Полымя. – 1998 – № 9 – С. 198-20.
2. ***Маныкина А.А.*** Изучение романа с учетом жанровой специфики в средней школе: Дисс. ... канд. пед. наук. – М., 1992. – 217 с.
3. ***Лазарук М.*** Родная літаратура і школа // Полымя. – 1994. – № 10 – С. 217-227.
4. Методика преподавания литературы / Под ред. ***З.Я. Рез.*** – М.: Просвещение, 1987. – 382 с.
5. ***Ортега-и-Гассет Х.*** Краткий трактат о романе // Вопр. литературы. –1987. – № 9 . – С. 169-205.


## SUMMARY


*The article deals with the actual problem of the methods of teaching Belarussian literature that is the study of modern intellectual prose the 11th forms. The material is based on the principals the conception of literary education in secondary school, such novels as "The Sign of Trouble" and "In the Fog" and the literary works by F.Dostoyevsky and A.Kamu being taken as an example.*

*The author puts forward his own understanding of the analytical prose studying, his notion being based on the analysis of "the tragic" as a philosophic-aesthetical category, as well as the problems of the existential choice, the artistic principals of analytical writing, the genre-stylistic peculiarities of the analyzed literary works. This contributes to better conceptual comprehension of V.Bykov's prose, forms theoretical competence and aesthetic culture of school leavers.*


Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова